2. Новы Запавет / Секцыя па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі ; пер. з арыгінальнай мовы. – Мінск : Про Хрысто, 2017. – 688 с.
3. Памятники литературы Беларуси X–XVIII веков / сост., лит. обраб. текста, пер. на рус. яз. : И. В. Саверченко. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – 464 с.
4. Францыск Скарына і яго час: энцыкл. давед. / Беларус. Сав. Энцыклапедыя; рэдкал. : І. П. Шамякін [гал рэд.] і інш. – Мінск : БелСЭ, 1988. – 608 с.

Аляксандр Цікоцкі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ЛЕКСІКА НА СТАРОНКАХ СУЧАСНЫХ ДРУКАВАНЫХ СМІ: ФУНКЦЫЯНАВАННЕ І СПОСАБЫ ТЛУМАЧЭННЯ

Лексіка-стылістычная структура сучасных медыятэкстаў характарызуецца, як вядома, значным багаццем і разнастайнасцю. Яна ўключае элементы розных стылістычных пластоў. Сярод іх даволі значнае месца займаюць розныя віды спецыяльнай лексікі, што не дзіўна: у перыядычных выданнях рэгулярна з'яўляюцца публіцыстычныя тэксты, прысвечаныя пытанням навукі, тэхнікі, медыцыны, эканомікі, спорту, якія немагчыма ўявіць без ужывання ў большай або меншай меры розных відаў спецыяльнай лексікі – тэрмінаў і прафесіяналізмаў. Зразумела, што ў выданнях, разлічаных на шырокую аўдыторыю, якая ўключае і неспецыялістаў у адпаведнай галіне, чытач павінен быць падрыхтаваны да ўспрымання такіх слоў і спалучэнняў, сэнс іх павінен быць тым або іншым шляхам растлумачаны.

Тэма гэта, безумоўна, не новая, камусьці яна можа падацца нават збітай. Але гэта не так. Прынцыпу камунікатыўнай агульназначнасці (агульнадаступнасці) ніхто не адмяняў, а аналіз ужывання ў сучасных медыятэкстах спецыяльнай лексікі (як і іншых відаў неагульнадаступнай лексікі) паказвае, што выпадкі яе выкарыстання без адпаведнага тлумачэння па-ранейшаму сустракаюцца дастаткова часта. «Багатая і разнастайная эмпірыя фактаў, якія адносяцца да гэтай праблемы, не толькі пастаянна абнаўляецца, але і павялічваецца» [1, с. 59].

Гэтую праблему можна разглядаць у двух аспектах: арталагічным (культурна-маўленчым), паколькі закранае пытанне зразумеласці, адэкватнага ўспрымання рэцыпіентам адпаведнай лексемы (або словаспа-

лучэння), і функцыянальным (функцыянальна-стылістычным), паколькі яна звязана таксама з адным з фундаментальных прынцыпаў мовы газеты – прынцыпам агульнадаступнасці.

Зразумела, што далёка не кожнае спецыяльнае слова (напр., навуковы тэрмін) патрабуе адпаведнага ўводу ў тэкст, тлумачэння. Многія з такіх лексем даўно ўжо сталі шырока вядомымі, зразумелымі для любога больш-менш адукаванага, эрудзіраванага чалавека. Гаворка ідзе не пра такія словы, а пра т. зв. вузкаспецыяльную лексіку. Але і яна, як паказвае вывучэнне гэтай праблемы, тлумачыцца адпаведным чынам далёка не заўсёды.

Так, у нумары «Звязды» ад 27.07.2018 чытаем: «За паўгода былі зроблены некаторыя крокі, якія ўжо атрымалі адабрэнне ў сельскага насельніцтва Аршанскага раёна. Там, дзе не справілася кааперацыя, прыйшоў буйны *рытэйлер*». І далей: «таксама… у малым бізнесе складана быць канкурэнтаздольным. Важна аб'ядноўвацца і каардынаваць *лагістыку* закупкі». Значэнне слоў «рытэйлер» і «лагістыка» не растлумачана, цяжка зразумець іх і з кантэксту. Як паказвае вывучэнне пытання, такія выпадкі часцей сустракаюцца ў тэкстах, аўтарамі якіх з'яўляюцца не прафесійныя журналісты, а спецыялісты ў адпаведнай галіне. Таму пры падрыхтоўцы такіх матэрыялаў да друку трэба быць асабліва ўважлівымі.

Якімі ж спосабамі спецыяльнае слова звычайна ўводзіцца ў тэкст. Тут часцей за ўсё выдзяляюць наступныя: 1) апісальны (апісанне дзеяння прадмета, прыбора і г. д., названага тэрмінам); 2) сінанімічны (з дапамогай сінонімаў). Некаторыя выдзяляюць таксама змешаны (сінанімічна-апісальны). Нарэшце, існуе яшчэ прыём т. зв. ускоснага тлумачэння, калі сэнс адпаведнага слова можна зразумець з кантэксту [2].

Звернемся да прыкладаў: «Не сакрэт, што сельская гаспадарка з'яўляецца адной з асноўных крыніц забруджвання навакольнага асяроддзя, у прыватнасці водных рэсурсаў. Асабліва распаўсюджанае забруджванне вады угнаеннямі з азотам і фосфарам, што выклікае *эўтрафікацыю* – «бросненне» вадаёмаў, уключаючы само Балтыйскае мора» (Звязда, 27.07.2018). «Унікальнымі для айчыннай археалогіі з'яўляюцца знойдзеныя інструменты шкловыдзімальшчыкаў, сярод якіх выдзімальная трубка, нож, *мерная гірка*, пры дапамозе якой маглі адмераць колькасць рэчываў, што дадаваліся ў сыравіну пры вытворчасці шкла» (Звязда, 26.07.2018). У першым выпадку тэрмін «эўтрафікацыя» тлумачыцца з дапамогай адпаведнага сінаніма, у другім спалучэн-

не «мерная гірка» тлумачыцца шляхам указання на яе прызначэнне. Возьмем яшчэ прыклад: «Як і ў фільме «Бягучы па лязе», дзе адным з галоўных герояў была т. зв. *рэплікант* Рэйчэл, якая лічыла сябе чалавекам і з'яўлялася супрацоўнікам карпарацыі, што стварае *рэплікантаў*, Зоі даведваецца пра сваю штучную прыроду…» (Звязда, 26.07.2018). У гэтым тэксце слова «рэплікант» ніяк не тлумачыцца, але з кантэксту можна здагадацца, што так у сучаснай навуковай фантастыцы называюць штучна створаных людзей.

У шэрагу выпадкаў сэнс больш шырокага, агульнага паняцця раскрываецца шляхам указання на больш вузкія паняцці, якія яно ў сябе ўключае: «Каваныя рашоткі будуць утрымліваць *дэкаратыўныя элементы (скульптуры, барэльефы)* ваеннай тэматыкі» (Звязда, 13.07.2018). «Няма сур'ёзных змен і ў таварнай структуры экспарту. Захоўваецца высокая доля *сыравінных тавараў (калій, нафтапрадукты)*» (Звязда, 13.07.2018). Тут сэнс спалучэнняў «дэкаратыўныя элементы» і «сыравінныя тавары» тлумачыцца ўказаннем на тое, што яны ўключаюць.

Такім чынам, аўтарам і рэдактарам варта абачліва ставіцца да ўжывання ў тэкстах друкаваных СМІ спецыяльнай лексікі, бо прызначаны для шырокага кола чытачоў матэрыял можа выклікаць іх неразуменне і ў выніку зніжэнне цікавасці да выдання.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Коготкова, Т. С. Профессионально-терминологическая лексика в газете (Способы раскрытия и введения в текст) / Т. С. Коготкова // Терминология и культура речи. – М. : Наука, 1981. – С. 58– 92.
2. Терехова, В. С. Специальная лексика в языке газеты / В. С. Терехова. – Л. : Изд. ЛГУ,1982. – 136 с.

Маргарита Цыбульская
Белорусский государственный университет (г. Минск, Беларусь)

ЖУРНАЛИСТСКИЙ ТЕКСТ: КОММУНИКАТИВНО-ПРАГМАТИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

Журналистский текст сегодня – сложное коммуникативное явление, находящее выражение в языковой форме, которая, в свою очередь, представленная в журналистском тексте, репрезентирует когнитивные особенности, во-первых, участников коммуникации, а во-вторых, дискурса СМИ в целом, нуждается во всестороннем изучении его коммуникативно-прагматической устроенности.